Алена
Каралёва

загадчык аддзела навукова-метадычнага
і псіхолага-педагагічнага суправаджэння
дадатковай адукацыі УА «Нацыянальны цэнтр
мастацкай творчасці дзяцей і моладзі»
(г. Мінск, Беларусь)

# Улік асаблівасцей традыцыйнай культуры беларусаў у фарміраванні нацыянальнай ідэнтычнасці

Культура — тая атмасфера, якую стварае народ для свайго выжывання.

*Ю. Лотман*

Вялікая ўвага ў апошні час адводзіцца даследаванню такіх элементаў культуры, як каштоўнасці і нормы. Пры разглядванні традыцыі ў якасці структуры ўзаемазвязаных элементаў акцэнт робіцца на асаблівасцях культуры, якія «пранізваюць» усе яе элементы і праяўляюцца ў паводзінах яе членаў.

Традыцыйная культура беларусаў — «аўтэнтычная народная культура, якая ўключае фальклор, мову, народны тэатр, традыцыйныя абрады, народнае дэкаратыўна-прыкладное, выяўленчае мастацтва, дойлідства, фальклярызаваныя формы рэлігійных уяўленняў, літаратурных твораў, навуковых і практычных ведаў» [1, *611*] — неад'емная частка агульначалавечай культуры. Гэтыя духоўныя здабыткі беларускага народа з'яўляюцца наймагутнейшымі фактарамі этнічнай самаідэнтыфікацыі — паступовага перанясення індывідам на сябе (інтэрыярызацыі) якасцей этнічнай супольнасці, у якой індывід фарміруецца як асоба; усвядомленае ці неўсвядомленае перажыванне індывідам сваёй прыналежнасці да этнічнай групы, яе культуры, традыцый, сістэмы каштоўнасцей.

Комплексны аналіз даследчых прац такіх знаўцаў беларускай традыцыйнай культуры, як Г. П. Арлова, Г. А. Барташэвіч, У. А. Васілевіч, К. П. Кабашнікаў, В. В. Кірыенка, У. М. Конан, А. Н. Курыловіч, Т. І. Кухаронак, А. С. Ліс, В. Д. Ліцьвінка, А. М. Ненадавец, Л. В. Ракава, Е. Р. Раманаў, С. В. Снапкоўская, І. В. Чаквін і інш., дазволіў нам выдзеліць асаблівасці традыцыйнай культуры беларусаў.

Традыцыйную беларускую культуру даследчыкі адносяць да *культуры цыклічнага поліхраматычнага адчування часу* [2].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У псіхалогіі цыклічнага поліхраматычнага адчування часу ідэя часу звязана з ідэяй паўтаральнасці, цыклічнасці: усё нараджаецца, развіваецца, памірае, нараджаецца зноў, абнаўляецца на новым вітку жыцця і г. д. Мінулае, сучаснае і будучае існуюць у любой паслядоўнасці, нелінейна. Адсюль адначасовае выкананне некалькіх спраў чалавекам, які ўзрос на гэтай культуры.

Сучаснае можа знікаць, не мець каштоўнасці. Адсюль частае звяртанне чалавека ў думках да мінулага, летуценнасць, сузіральнасць. Ён упэўнены, што будучым нельга ўпраўляць, таму не такі саманадзейны ў сваіх планах на яго.

Адносіны да дакладнасці ў часе як да чагосьці другараднага. Адсюль няспешнасць, замена планаў пад уздзеяннем новых абставін.

Арытмічнае пачуццё часу, яго «спрэсаванасць» у адны перыяды (вясна—лета—восень) і «расцягванне» ў іншыя (зімовы перыяд). Гэта абумоўлена аб'ектыўнай неабходнасцю арганізацыі жыццядзейнасці людзей, уключаных у прыродныя цыклы.

Лепшае выкарыстанне часу — міжасабовыя зносіны, захаванне гармоніі ў адносінах. Гармонія з людзьмі і грамадствам — адзін з галоўных гуманістычных ідэалаў традыцыйнай беларускай культуры.



Святочная абраднасць беларусаў адпавядае цыклічнай поліхраматычнай мадэлі часу — час падзяляецца на адносна замкнёныя цыклы: гадавое кола (веснавых, летніх, восеньскіх, зімовых свят); цыкл сямейных свят (нараджэнне, хрэсьбіны, вяселле, смерць); сутачны цыкл (ранішні і вячэрні золак, поўдзень і поўнач).

«Спрэсаванасць», дынамічнасць часу ў адзін перыяд і яго «расцягнутасць» у другі ў беларускай культуры адзначае і даследчык А. С. Ліс. «Вясна развівалася дынамічна і мела свае этапы… Невыпадкова ніводзін з чатырох цыклаў беларускага гадавога каляндарна-абрадавага круга не мае ў сваім складзе столькі песенных разнавіднасцей, як веснавы, — аж дзевяць. Дзеля параўнання адзначым, што, напрыклад, багаты каляднанавагодні цыкл уключае тры жанравыя разнавіднасці каляндарных твораў, летні — таксама тры. Крыху больш восеньскі» [3, 6].

У рамкі цыклічнай поліхраматычнай мадэлі часу ўкладваецца і беларуская гасціннасць: нельга быць гасцінным адну-дзве гадзіны, гэта справа няспешная, рытуальная. Беларусы ў большасці не могуць прыйсці ці пайсці з гасцей своечасова, яны часта «затрымліваюцца ў гасцях».

Даследаванне В. В. Кірыенка паказала, што «часовы тэмпарытм сучасных беларусаў ва ўмовах індустрыяльна-ўрбаністычнага асяроддзя карэкціруецца: цыклічнае поліхраматычнае адчуванне часу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паступова змяняецца лінейным монахраматычным[1], фарміруецца сінтэтычнае лінейна-цыклічнае адчуванне часу, і гэты працэс далёкі ад завяршэння» [2, *20*].

*Традыцыйную беларускую культуру можна аднесці да калектывісцкай культуры.* У калектывісцкіх культурах (па тыпалогіі Т. Г. Стэфаненка [4]) існуе культ агульнасці, пачуццё арцельнасці, абавязку, якія садзейнічаюць захаванню адзінства групы, узаемасувязі яе членаў, гарманічных адносін паміж імі. Важна жыць не проста побач з іншымі, а сумесна з іншымі, узгадняць свае дзеянні ў вытворча-гаспадарчым, бытавым, асабістым жыцці. Пры размеркаванні рэсурсаў у такой культуры прэвалююць нормы справядлівасці, якія забяспечваюць сацыяльную роўнасць у задавальненні патрэбнасцей. Алгарытм калектыўнага жыццязабеспячэння, узаемадапамогі, узаемаабмену, міласці да гаротных напраўлены на выраўноўванне матэрыяльнага дастатку. Аказанне дапамогі, спачуванне, саўдзел з'яўляюцца нормай. Члены традыцыйнага беларускага грамадства імкнуцца да бесканфліктных адносін. Цэняцца міжасабовыя адносіны, кааперацыя і сціпласць[2].

Успомнім, што ў беларускіх жыхароў існавалі такія звычаі, як «талака» — збор беларускіх сяльчан дзеля выканання тэрміновай цяжкай працы: пабудаваць дом, накасіць сена, вывезці лес, сабраць ураджай і інш., «сябрына» — сумеснае карыстанне пчоламі, скацінай, «бонда» — частаванне свежанінай, садавінай, хлебам з новага ўраджаю.



Існавала адказнасць усяго роду за кожнага яго члена. Так, дарослыя члены сям'і ў беларускай традыцыйнай культуры неслі адказнасць за

[1] Дзеля параўнання: у логіцы лінейнай монахраматычнай мадэлі часу сучаснае не можа быць раней мінулага, а будучае раней сучаснага. Чалавек у такой культуры вырашае праблему «лінейна», «па кроках», ад аднаго этапу да другога, рухаючыся прама да мэты. У такой культуры не важна, што было ўчора ці ў мінулым, усё напраўлена ў будучае. Адсюль дысцыплінаванасць у часе, абавязковасць, бо час — гэта грошы.

[2] Дзеля параўнання: згодна з тыпалогіяй Т. Г. Стэфаненка ў індывідуалістычных культурах назіраецца прыярытэт асобы, яе самадастатковасць, аўтаномія, дыстанцыраванасць. Асабістае жыццё з'яўляецца ўласнай прыватнай справай. Праяўленне як сімпатыі, так і антыпатыі, спачування сабе ці іншым членам групы — парушэннем нормы. Чалавек прымае рашэнні і дзейнічае згодна са сваімі асабістымі мэтамі, аддае ім перавагу перад грамадскімі. Ён ведае і раздзяляе толькі тыя каштоўнасці групы, якія забяспечваюць рэалізацыю яго індывідуальных інтарэсаў. Уваходзіць у многія групы, але слаба з імі ідэнтыфікуецца (акрамя нуклеарнай сям'і). Канфлікт лічыцца нармальным спосабам вырашэння ўзнікшых непаразуменняў. Падтрымліваецца дэманстрацыя ведаў і навыкаў, канкурэнцыя, спаборніцтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўтойванне злачынства аднаго з іх. Адказнасць знімалася толькі ў тых выпадках, калі сям'я не ведала пра злачынства свайго родзіча.

Узгадаем і экстравертнасць беларусаў: пазнаём самі сабе часцей вачамі іншых, чым сваімі ўласнымі; для нас важна атрымліваць пастаянную эмацыянальную падтрымку блізкіх; існуе некая сугестыўная залежнасць беларусаў ад ацэнак міру, родных, блізкіх і знаёмых.

Пры гэтым мы раздзяляем думку Т. Г. Стэфаненка, што «як і любая тыпалагізацыя культур, раздзяленне культур на індывідуалістычныя і эмпірычныя — звышспрашчэнне. Вынікі тэарэтычных і эмпірычных даследаванняў ускладняюць карціну. Два культурныя сіндромы могуць суіснаваць і ў залежнасці ад сітуацыі, напрыклад у адносінах да розных груп і розных мэт узаемадзеяння, больш ці менш ярка праяўляцца ў кожнай культуры, у кожнага чалавека» [4, *109*].

Не можа не цешыць той факт, што ў сучасным грамадстве назіраецца ўсплеск цікавасці да беларускай традыцыйнай культуры пры ўсёй адкрытасці розных культур, этнасаў, іх узаемадзеяння. Вывучэнне каштоўнасцей культуры, сацыяльна-псіхалагічных аспектаў этнічнай ідэнтычнасці ёсць шлях да пазнання культуры. Неабходна так мабілізаваць гістарычны вопыт беларускага народа дзеля яго актуальнага выкарыстання, каб сфарміраваць сістэму каштоўнасных арыенціраў, сугучную каштоўнасным арыенцірам сваёй этнічнай культуры. Этнас ці асобныя індывіды, якія механічна запазычваюць «чужыя» духоўныя каштоўнасці, тыпы мыслення, страчваюць здольнасць ствараць у рамках як роднай, так і чужой культуры. А культура, як лічыць Б. Пастарнак, — гэта «пладатворнае існаванне», г. зн. існаванне, якое павінна прыносіць плады. Сёння неабходна выхоўваць такую культурную асобу, якая здольна да канвергенцыі каштоўнасных арыентацый розных тыпаў культур пры ўмове захавання этнічных канстант роднай культуры; фарміраваць такога суб'екта асабістага жыцця, які ўмацаваны ў сваёй культуры і здольны да творчага яе пераўтварэння.



*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Т. 2. — Мінск : БелЭн, 2006. — 832 с.

2. *Кириенко*, *В. В.* Менталитет современных белорусов (социологический анализ) : дисс. ... д-ра соц. наук : 22.00.06. / В. В. Кириенко. — Минск, 2007. — 244 с.

3. *Ліс*, *А. С.* Беларуская каляндарна-абрадавая песня ў кантэксце фальклорных традыцый славян / А. С. Ліс. — Минск : Беларус. навука, 2008. — 296 с.

4. *Стефаненко*, *Т. Г.* Этнопсихология : учебник для вузов / Т. Г. Стефаненко. — 4-е изд., испр. и доп. — М. : Аспект Пресс, 2009. — 368 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ